Д.У.Дук

# Вывучэнне і ахова культурнага пласта гістарычнага цэнтра Полацка

З лістапада 2000 года ахова культурнага пласта ў самым старажытным горадзе Беларусі – Полацку – ажыццяўляецца ў межах ахоўнай зоны Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка рэспубліканскага значэння. Паводле Палажэння НПГКМЗ, усе прамысловыя работы ў межах ахоўнай зоны павінны праводзіцца толькі з дазволу Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь па прадстаўленню Полацкага гарвыканкама. Важную ролю ў рэалізацыі гэтага Палажэння адыграла пастанова Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь «Аб зацвярджэнні палажэння аб ахове археалагічных аб'ектаў пры правядзенні земляных і будаўнічых работ» ад 22 мая 2002 г.

Рэалізацыя адзначаных палажэнняў праводзіцца праз Беларускі камітэт па помніках і мясцінах (ІКАМОС). На наш погляд, перспектыўным і вельмі важным накірункам у дзейнасці ІКАМОС з'яўляецца заключэнне гаспадарчых дамоў з арганізацыямі, якія праводзяць земляныя работы, не толькі на археалагічны нагляд, але і на фінансаванне археалагічных раскопак у зонах будаўніцтва.

Не менш важным пытаннем застаецца арганізацыя пастаянна дзеючай археалагічнай экспедыцыі ў Полацку. Правядзенне прэвентыўных раскопак у межах зон новабудоўляў і тэрыторый з інтэнсіўным разбуральным уздзеяннем на культурны пласт у выніку гаспадарчай дзейнасці дазволіць пазбегнуць страты каштоўнай інфармацыі аб гістарычным мінулым горада. На сённяшні дзень склаўся пэўны вопыт вядзення палявога археалагічнага даследавання на базе Полацкага дзяржаўнага універсітэта. Першыя раскопкі сіламі выкладчыкаў і студэнтаў ПДУ праведзены ў 1995 годзе (раскоп С.Тарасава і М.Клімава на Верхнім замку), з 2000 года раскопкі ў горадзе пачалі праводзіцца штогадова. Кафедра гісторыі

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

і сацыялогіі ПДУ мае неабходную матэрыяльную базу і рэсурсы для забеспячэння работы археалагічнай экспедыцыі, што паказалі вынікі трох апошніх палявых сезонаў. Важным момантам з'яўляецца факт пашырэння колькасці асобаў, якія могуць атрымаць першасныя веды і навыкі вядзення палявога археалагічнага даследавання і маюць перспектыву стаць палявымі археолагамі.

Археалагічныя раскопкі і назіранні ў Полацку праводзяцца ў залежнасці ад канкрэтных мэт і навуковай запатрабаванасці, аднак жа дзейнасць калекцыянераў, аматараў даўніны і краязнаўцаў вядзецца літаральна штодзённа. Традыцыйнае стаўленне археолагаў да прыватных калекцыянераў і збіральнікаў даўніны не заўжды станоўчае, і віною гэтаму розныя фактары, нярэдка па віне гэтак званых «чорных» археолагаў. Больш таго, у сучаснай айчыннай гістарыяграфіі фактычна адсутнічае вопыт выкарыстання артэфактаў з прыватных калекцый. Насамрэч, можа існаваць толькі адна аб'ектыўная прычына абмежаванасці крыніцазнаўчай базы асобна ўзятых артэфактаў – гэта адсутнасць сувязі знаходак са стратыграфіяй культурнага пласта археалагічнага помніка і прывязкі іх да комплексу сінхронных рэчаў. У гэтай сувязі неабходна заўважыць наступнае. Па-першае, менавіта пры непасрэдным удзеле энтузіаястаў, рознага роду аматараў даўніны і калекцыянераў археалогія здолела накапіць неабходны патэнцыял і з антыкварнай справыператварылася ў самастойную гістарычную навуку. Па-другое, у археалогіі важнасць і вартасць артэфакта прыраўніваецца да вартасці аб'ектыўных ведаў і разглядаецца як крыніца гістарычнага пазнання [1], па гэтай прычыне можна сцвярджаць, што пад'ёмны археалагічны матэрыял, сабраны пры розных абставінах, з'яўляецца паўнавартаснай гістарычнай крыніцай.

Пры супрацоўніцтве з полацкімі аматарамі даўніны (В.Дзмітрыевым, С.Міхейкам, А.Салаўёвым і інш.) атрыманы новыя звесткі аб артэфактах, некаторыя з якіх сёння ўжо сталі часткай сучасных ведаў аб адметнасці матэрыяльнай культуры палачан [2].



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Падчас збіральніцкай дзейнасці В.Дзмітрыева і С.Міхейкі (абодва з'яўляюцца прафесійнымі гісторыкамі і вядомыя ў горадзе як краязнаўцы, нумізматы і збіральнікі даўніны) былі знойдзены серыі артэфактаў розных гістарычных эпох. Картаграфія знаходак дазваляе вызначыць, што найбольшая колькасць прадметаў дробнай мастацкай пластыкі прыходзіцца на ўзбярэжжа Дзвіны ў раёне ад вусця Палаты да заходняй ускраіны Запалоцця, што прыкладна на 300 м ніжэй мяжы ахоўнай зоны гісторыка-культурнага запаведніка. У якасці прыкладу разгледзім некаторыя артэфакты серыйнай вытворчасці з прыватнай калекцыі В.Дзмітрыева і С.Міхейкі.

Дзве срэбраныя рэчы разглядаюцца намі як падвескі і з'яўляюцца абсалютнымі рарытэтамі (мал. 1:1). Адна з падвесак знойдзена на правым беразе Дзвіны ў раёне сучаснага аўтамабільнага маста праз Экімань і Запалоцце, другая – на тэрыторыі прыватнай сядзібы ў Запалоцці.

Падвескі маюць доўгі стрыжань, шасціграннную галоўку з вушкам дыяметрам 0,25 см і выступаючы носік – дзюбку. Даўжыня аднаго вырабу 4,9 см, другога 4,6 см, шырыня галоўкі адпаведна 1,4 см і 1,2 см, адна падвеска мае чатыры рыфлёныя палоскі пад вушкам, другая – толькі адну, якая ледзьве прасочваецца на адным з бакоў.

Аналагаў гэтым дзвюм рэчам не выяўлена, час іх бытавання можна вызначыць толькі ўмоўна ў межах ранне-княжыцкага перыяду. Тыпалагічна падобныя артэфакты набліжаны да круга фіна-вугорскіх старажытнасцяў, што не выключае іх рытуальную функцыю.

Другая цікавая катэгорыя серыйных вырабаў – гэта бронзавыя ключыкі ад ларцаў, якія захоўваюцца ў калекцыі С.Міхейкі ў колькасці 5 экзэмпляраў, з іх 3 – цэлыя, астатнія прадстаўлены фрагментарна. Ключыкі знойдзены на тэрыторыі Запалоцця, два з іх – на берагах Заходняй Дзвіны. Усе цэлыя ключыкі маюць багатую арнаментацыю і, нягледзячы на мініяцюрныя памеры, з'яўляюцца функцыянальнымі рэчамі.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Ключык № 1 мае двухбаковую выяву жывёлы і наступныя памеры: агульная даўжыня складае 3 см, дыяметр рукаяці 1 см, дыяметр утулкі 0,25 см (мал. 1:3). Ключык № 2 з аднабаковай выявай чатырохпялёсткавай кветкі на рукаяці, яго даўжыня 2,6 см, дыяметр рукаяці 1 см і дыяметр утулкі 0,25 см (мал. 1:4). Ключык № 3 аздоблены аднабаковай выявай фантастычнай жывёлы, яго памеры і прапорцыі аналагічныя ключыку № 1, за адным выключэннем: ён мае больш шырокую «бародку» – 0,4 см, тады як у папярэдніх ключыкаў яна роўная 0,25 см (мал. 1:5). Фрагменты верхніх частак ключыкаў № 4 і № 5 (мал. 1:6-7) ніякіх істотных адрозненняў ад вышэй згаданых вырабаў не ўтрымліваюць, магчыма, яны з'яўляліся нарыхтоўкамі, аб чым сведчыць грубая апрацоўка паверхні (вынік няўдалай адліўкі?) і адсутнасць дэкарацый.

Усе полацкія ключыкі знойдзены ў недатаваных пластах. Традыцыйна ў дэкоры ключыкаў выкарыстоўвалася міфалагічная тэматыка – гэтак званае геральдычнае супрацьстаянне. Вельмі падобная, а фактычна аналагічная выява фантастычнай жывёлы сустракаецца на замочных накладках з Ізборска і Пскова [3], якія датуюцца XIII ст.

Адна рэдкая знаходка з Запалоцця – наверша шпількі (знойдзена В.Дзмітрыевым) – належыць да групы прадметаў скандынаўскага паходжання (мал. 1: 8). Шпілька выраблена з бронзы і, верагодна, была згублена ў выніку механічнага пашкоджання – стрыжань, на якім трымалася наверша шпількі, абламаны. Адзінкавасць знаходкі і стылістычныя асаблівасці рэчы ставяць пад сумненне яе мясцовую вытворчасць.

Такім чынам, на прыкладзе прэзентаванай падборкі рэчавага матэрыялу з прыватных збораў відавочна, што незалежна ад умоў, у якіх была знойдзена тая ці іншая рэч, пры наяўнасці нават мінімальнай інфармацыі аб месцы і абставінах знаходкі, можна атрымаць важныя высновы аб узроўні развіцця матэрыяльнай і духоўнай культуры палачан у розныя гістарычныя эпохі. Маса-

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова




Мал. 1. Артэфакты з калекцыі В.Дзмітрыева і С.Міхейкі.

вае знаходжанне прадметаў дробнай мастацкай пластыкі ў раёне Запалоцця падкрэслівае значнасць гэтай тэрыторыі ў гістарычным развіцці Полацка. Слабая археалагічная вывучанасць старажытнага Запалоцкага пасада вартая працягнення тут археалагічных раскопак, што, на нашу думку, з'яўляецца адной з прыярытэтных задач полацкай археалогіі [4].

Вынікі дзейнасці калекцыянераў і аматараў даўніны дазваляюць ставіць пытанне аб уключэнні Дзвіны ў ахоўную зону гістарычнага цэнтра Полацка. Рэчышча не мае культурнага пласта ў традыцыйным яго разуменні, аднак рака ў межах горада мае сляды актыўнага ўмяшальніцтва антрапагеннага фактару. Канцэнтрацыя артэфактаў на адзінку аб'ёму рачных адкладаў значна большая, чым у культурных напластаваннях гістарычнай часткі горада. Адметнасцю Дзвіны можна лічыць тое, што на працягу стагоддзяў яна не змяніла сваіх абрысаў і з'яў-

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ляецца на дзіва ўстойлівым элементам гарадской тапаграфіі. З-за адсутнасці стратыграфіі палявыя доследы ў рацэ вымушаюць выкарыстоўваць спецыфічныя метады падводнай археалогіі. Апошняе асабліва актуальна з улікам актыўнай дзейнасці рачнога суднаходства па здабычы пяску.



Мал.2. Баявая сякера (1) і універсальна-гаспадарчыя сякеры (2,3).

Спецыфіка археалагічнага назірання (навуковая вартасць якога з усімі агаворкамі з'яўляецца бясспрэчнай), як гэта не парадаксальна, вельмі нагадвае збор пад'ёмнага матэрыялу падчас археалагічных разведак ці «промыслаў» калекцыянераў. Часта археолагу даводзіцца канстатаваць факт разбурэння культурнага пласта і задавальняцца зборам пад'ёмнага матэрыялу, з якога большая частка вывозіцца на іншае месца разам з самім культурным пластом ці ў пашкоджаным выглядзе зноў ссыпаецца ў траншэю. Навуковая фіксацыя тычыцца пераважна толькі метааб'ектаў (вызначэнне магутнасці культурнага пласта на частцы гарадской тэрыторыі, наяўнасць архітэктурных аб'ектаў, напаўненне і склад культурных напластаванняў, іх стратыграфія і інш.). Сабраныя – фактычна выпадкова – артэфакты па сваёй сутнасці мала чым адрозніваюцца ад рэчаў, знойдзеных прыватнымі калекцыянерамі. Тым не менш, значэнне археалагічных назіранняў на сённяшнім этапе цяжка пераацаніць.

У выніку праведзеных намі ў апошнія гады археалагічных разведак і наглядаў былі выяўлены шэраг унікальных знаходак, сярод якіх неабходна вылучыць



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова



Мал. 3. Рукаяць шпагі з гардай і клінком.

мілітарыі і побытавыя рэчы індывідуальнай работы. Падчас работы з такімі артэфактамі адзіны надзейны індыкатар часу іх бытавання, пры адсутнасці прамых указанняў (стратыграфічны гарызонт, дата, надпіс, знакавая інфармацыя на прадмеце), вызначаецца з дапамогай тыпалагічна-параўнальнага метаду, метаду візуальнага аналізу і функцыянальнага прызначэння самой рэчы. У сапраўднай рабоце прапануецца вызначэнне навуковай каштоўнасці найноўшых археалагічных знаходак, большасць з якіх паходзіць са стратыграфічна не вызначанага культурнага пласта гістарычнага цэнтра Полацка.

Сякера, выпадкова знойдзеная будаўнікамі падчас земляных работ на тэрыторыі паўночна-заходняй часткі Запалоцця па вул. Шэнягіна, з'яўляецца унікальным відам абуховай зброі (мал. 2:1). Згодна з класіфікацыяй М.Глосэка, сякера найбольш блізка да тыпу XIII, яна мае шырокае палатно з двума сіметрычна закруглёнымі наскамі і авальнае лязо, вузкая правушына клінападобнай формы плаўна пераходзіць у высокую шыйку. Шыйка сякеры таксама мае два сіметрычна размешчаныя бакавыя выступы ў форме трохкутніка. Вышыня жалезкі складае 18 см, шырыня ляза 15 см.

Падобны тып сякер быў распаўсюджаны ў Цэнтральнай, Заходняй і Паўночнай Еўропе (Польшча, Англія, Скандынавія), дзе яны датуюцца XIII-XV стст. [5]. Іко-

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова




Мал. 4. Керамічныя вырабы (1-7), бронзавае наверша (8) і касцяная рукаяць (9) з траншэі на Верхнім замку (2001 г.).

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

награфічныя крыніцы з розных частак акрэсленага абшару прэзентуюць гэты тып сякер у батальных сцэнах канца XV ст., напрыклад, аблога Мальбарка 1460 года (абраз 1481-1488 гг.) [6] ці алтарная выява касцёла Найсвятлейшай Дзевы Марыі 1477-1489 гг. [7]. Адрозненне полацкай сякеры перш за ўсё ў большай вышыні тапарыскі: яна амаль роўная шырыні ляза (адпаведна 13 і 15 см), што надае вырабу ўзнёсласць і змяняе прысадзістасць, характэрную для цэнтральнаеўрапейскіх сякер, на выцягнутыя ў плане прапорцыі.

На жаль, стратыграфічным метадам прадатаваць полацкую знаходку не ўяўляецца магчымым, найбольш верагодна, што гэтая сякера магла ўжывацца з канца XV па сярэдзіну XVI ст. На карысць прапанаванай датыроўкі сведчыць форма адтуліны пад тапарышча, якая мае не кроплепадобныя абрысы, найбольш характэрныя для познесярэднявечнай традыцыі, а набліжаны да трохкутніка выгляд.

Наступны тып сякеры шырока вядомы ў Польшчы, Чэхіі, Літве, Швецыі [8]. Гэтыя сякеры ўжываліся ад XIV да XVII ст. і, па меркаванню некаторых даследчыкаў [9], належалі да універсальна-гаспадарчага тыпу, але адначасова маглі выкарыстоўвацца і як зброя (мал. 2:3). Назіранне за полацкай сякерай [10], знойдзенай краязнаўцам А.Салаўёвым у вусці Палаты, дазваляе зрабіць выснову, што яна была зроблена менавіта ў якасці зброі. На гэта ўказваюць наступныя прыкметы. Вышыня жалезкі роўная 16,5 см, сякера мае шырокую правушыну акруглай формы з прамым верхам, шырыня правушыны набліжана да вышыні і роўная 3,5 см, шыйка сякеры масіўная, яе таўшчыня ніжэй правушыны складае 2,2 см, вышыня – 2,5 см. Лязо сякеры вострае, за выключэннем носіка, які мае шчарбіны, захаваўшы, такім чынам, сляды ад удару па цвёрдаму, хутчэй за ўсё металічнаму прадмету. Выраблясць сякеру такой высокай якасці выключна дзеля задавальнення гаспадарчых патрэб наўрад ці было б мэтазгодным, механічныя пашкоджанні носіка ляза напра-

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

мую сведчаць аб выкарыстанні яе ў бойцы ў якасці цяжкой рыцарскай зброі, што дазваляе вызначыць час бытавання сякеры не пазней другой паловы XVI ст.

Другая вузкалязовая сякера паходзіць з ліку выпадковых знаходак, што знойдзены на тэрыторыі гістарычнай часткі горада Полацка і захоўваюцца ў фондах НПГКМЗ [11]. Сякера мае шырыню ляза напалову меншую за даўжыню, вонкавая грань корпуса блізкая да прамой, яе абух сплошчаны ў верхняй частцы, такія вырабы бяруць пачатак з XII–XIII стст., аднак сплашчэнне абуха пачынаецца не раней XV–XVI ст. [12]. Памеры сякеры – даўжыня 19 см, шырыня ляза 9 см, шырыня абуха 4,5 см (мал. 2:2). Па лязу сякеры праглядаецца гравіроўка ў выглядзе чатырох трохкутных зубцоў, размешчаных уздоўж паласы, паралельна верхняй грані. Функцыянальна не выключана баявое прызначэнне сякеры.

Вялікі комплекс побытавых рэчаў і мілітарыяў быў знойдзены намі падчас археалагічнага назірання за пракладкай траншэі пад дрэнаж на Верхнім замку ў 2001 годзе [13]. Большасць рэчаў стратыграфічна не датаваныя, паколькі былі знойдзены ў адвале, асобныя з іх з'яўляюцца вельмі рэдкімі і вартыя асобнага разгляду.

З унікальных рэчаў адзначым знаходку шпагі (рапіры) – гэта першы наяўны ўзор гэтай катэгорыі клінковай зброі на тэрыторыі Беларусі.

Захаваўся эфес з пятой ад клінка (мал. 3). Шпага мае выгнутую крыжавіну, шырынёй каля 9,5 см, якая пераходзіць у ахоўную дужку з адным захаваным круком, які служыў для абароны пальцаў. Шпага мела плоскі клінок, які не захаваўся і ад якога засталася толькі чатырохгранная, прамавугольная ў плане пята (0,6х1 см у сячэнні), традыцыйна пятка знаходзілася знутры гарды і не мела заточкі [14]. Рукаяць цэльнаметалічная, авальная ў плане з паўсферычным выступам на канцы, з дзвюма вострымі гранямі і дзвюма прадоўжнымі рыфлёнымі палоскамі, яе даўжыня 7 см пры максімальнай шырыні 3,5 см.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Нашэнне шпагі стала звычайным у паўднёваеўрапейскай пяхоце пасля 1560 года [15]. Нягледзячы на асобыя віды практычнага выкарыстання, шпага, урэшце, стала прыналежнасцю дварцовага туалета і паступова ў гэтай якасці згубіла сваё значэнне як зброя: яна стала атрыбутам годнасці і знакам прыналежнасці да вышэйшага стану.

Полацкая шпага належыць да тыпу IX па класіфікацыі В.Бехайма. Падобная форма клінка з'явілася ў Мілане, самы знакаміты клінок – гэта шпага Карла V з нанесеным календаром 1530 года [16]. Па аналогіі з заходнееўрапейскімі клінкамі полацкую знаходку можна датаваць сярэдзінай XVI – пачаткам XVII ст.

Як адзначае Ю.Бохан, сведчанняў менавіта баявога выкарыстання шпаг у Вялікім княстве Літоўскім не выяўлена, таму даследчык паставіў пытанне аб функцыянальным прызначэнні шпаг у арсеналах заможных феадалаў Вялікага княства Літоўскага [17]. На нашу думку, шпага, знойдзеная на Верхнім замку, з'яўляецца баявой, на карысць гэтага ўказвае адсутнасць дэкарацый, што характэрна менавіта для баявога тыпу рапір, гэта па-першае. Па-другое, шпага знойдзена ў заходняй частцы Верхняга замку, якая непасрэдна дамыкала да старажытных замкавых умацаванняў. Паходжанне шпагі цяжка высветліць, магчыма дапусціць, што яна звязана з паходам Стэфана Баторыя 1579 года, у выніку якога былі штурмам узяты ўмацаванні Верхняга замка. У выправе, акрамя апалчэння Вялікага княства Літоўскага, прымалі ўдзел польскія, нямецкія і вугорскія палкі. І немцы, і вугорцы маглі мець непасрэднае дачыненне да полацкай знаходкі, бо на тэрыторыі Германіі і Вугоршчыны знаходзіліся самыя вядомыя майстэрні па вытворчасці рапір [18].

У адвале траншэі на Верхнім замку было знойдзена шмат фрагментаў плінфы, памеры адной цэлай склалі 32x16x4 см, тры кавалкі больш старажытныя і магчыма належаць часу залажэння Сафійскага сабора – таўшчыня 2,5 см з клеймамі – штампамі ў выглядзе



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

крыжоў. Лекальная плінфа мае таўшчыню 3,6 см, захаваўся фрагмент на чвэрць часткі круга (мал. 4:1). Знойдзены таксама венца квадрыфольнай гаршковай кафлі і фрагменты сценак, памеры кафлі: дыяметр донца 8-9 см, венца 12 см, таўшчыня сценак 0,8-1,6 см, агульная вышыня вырабу складае 16,3 см (мал. 4:6). Кафля з аналагічнымі фізічнымі характарыстыкамі аднесена намі да трэцяга варыянту групы гаршковай кафлі, якая бытавала ў сярэдзіне XIV – пачатку XV ст. [19].

З іншых керамічных вырабаў вылучым плошку (мал. 4:7), амаль цэлы гаршчок (мал. 4:4), донца гаршка з кляймом (мал. 4:2) і плавільны тыгель (мал. 4:5). Гаршчок мае дыяметр венца 11 см, донца 9,5 см і вышыню 8 см, па плечуку ён аздоблены аднарадавым лінейным арнаментам з насечкамі. Плошка мае дыяметр венца 12 см, донца 8 см пры вышыні 3,2 см. Гэты посуд зроблены на ручным ганчарным крузе і мае аднолькавыя фізічныя характарыстыкі: чарапок карычневы на зломе, з дамешкамі буйназярністай жарствы і пяску. Гаршчок захаваў на донцы сляды матрыцы і стратыграфічна датуецца XII ст., таксама як і донца з кляймом. Датыроўка плошкі вызначаецца стратыграфічна – XII–XIII стст.

Літое бронзавае наверша для плеці ў выглядзе арлінай галавы, полае ўнутры, папярэдне можна датаваць XII ст. (мал. 4:8). Наверша мае наступныя памеры: вышыня 3,2 см, шырыня 2,8 см з дыяметрам утулкі 1,3 см. Наверша арнаментавана глазчатым і лінейным арнаментам, пры гэтым арнамент нанесены асіметрычна на розных частках: па дзюбе арла глазчаты арнамент двухбаковы, па ўтулцы – аднабаковы. Ідэнтычнае па форме наверша знойдзена ў Пскове ў напластаваннях XII ст. [20], адрозненне полацкай знаходкі ў больш багатым дэкоры і адсутнасці дадатковай адтуліны на ўтулцы.

Касцяная рукаяць для нажа мае памеры 10х2х1,3 см, яна аздоблена вельмі падобным на бронзавае наверша глазчатым і лінейным арнаментам (мал. 4:9) і па-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

пярэдне можа датавацца XI-XII стст. На прыкладзе апошніх двух артэфактаў пацвярджаецца думка аб устойлівасці асобных элементаў дэкора ў традыцыйнай матэрыяльнай культуры, відавочна, што ў дадзеным выпадку спрацоўвае універсальны механізм: чым старажытней катэгорыя рэчаў, тым менш варыяцыяў у аздабленні і форме яна ўтрымлівае. Гэтае правіла дзейнічае для большасці груп артэфактаў IX–XIII стст. і вызначае адметнасць матэрыяльнай культуры эпохі Сярэднявечча.

Правядзенне палявых археалагічных доследаў павінна насіць прэвентыўны характар на тых участках культурнага пласта, які пагражае разбурэнне ў выніку будаўнічай дзейнасці, абмежаванне толькі археалагічным наглядам на сённяшні дзень ужо нельга лічыць задавальняючым. Археалагічныя раскопкі павінны фінансавацца тымі арганізацыямі і ўстановамі, якія замаўляюць будаўніцтва згодна з рэспубліканскім заканадаўствам.

Далёка не ўсе пытанні ў вызначэнні характарыстыкі культурнага пласта і яго напаўнення ў розных гістарычных частках Полацка можна лічыць вырашанымі. Упэўнены, што ўяўленні сучаснікаў аб мінулым горада будуць значна пашыраны пры працягненні археалагічных даследаванняў. У гэтай сувязі перспектыўным накірункам з'яўляецца археалагічнае вывучэнне Запалоцкага пасаду з выкарыстаннем розных метадаў, у тым ліку падводнай археалогіі. Застаецца спадзявацца, што сумеснымі намаганнямі і пры дапамозе ўсіх зацікаўленых у гісторыі Полацка – слыннейшага горада старажытнай Беларусі – застанецца ўсё менш маладаследаваных старонак.

1. Kowalski K.M. Artefakty jako zrodla poznania. – Gdansk, 1993.
2. Дук Д.У. Полацкая кафля XIV – сярэдзіны XVI стст. // Гістарычна-археалагічны зборнік. – 2001, № 16. – С. 168.
3. Из археологической коллекции псковского музея. – Москва, 1994. – Фото 11.
4. Duk D. The State, Actual Problems and Perspectives of Development

Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

of the Archaeology of Polotsk // The Marine Archaeology of the Baltic Sea Area (IV), 2002. – P. 24–25.

5. Glosek M. Poznosredniowieczna bron obuchowa w zbiorach polskich. – Warszawa-Lodz, 1996. – S. 53.
6. Тамсама. – Rys. 18.
7. Uzbrojenie w Polsce sredniowiecznej 1350-1450 / Red. A. Nadolski. – Lodz, 1990. – S. 523.
8. Glosek M. Poznosredniowieczna bron obuchowa w zbiorach polskich. – S. 42-43, tabl. IV: IXa.
9. Археалогія Беларусі. У 4 т. Т. 4. Помнікі XIV-XVIII стст. – Мн., 2001. – С. 280; Glosek M. Poznosredniowieczna bron obuchowa w zbiorach polskich. – S. 43.
10. Захоўваецца ў асабістай калекцыі А.Салаўёва.
11. Нацыянальны Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік. – Кдф-3, № 1340.
12. Археалогія Беларусі. У 4 т. Т. 4. – С. 262.
13. Дук Д.У. Справаздача аб палявых археалагічных даследаваннях у Полацку ў 2001 г. // Архіў ІГ НАНБ. Вопіс 1, спр. № 1921. – С. 20.
14. Бехайм В. Энциклопедия оружия / Пер. с нем.; Предисл. А.Н. Кирпичникова. – СПб., 1995. – Рис. 318.
15. Тамсама. – С. 214.
16. Тамсама. – С. 212.
17. Бохан Ю.М. Узбраенне войска ВКЛ другой паловы XIV – канца XVI ст. – Мн., 2002. – С. 130.
18. Zygulski Z. Bron w dawnej Polsce na tle uzbrojenia Europy i Bliskiego wschodu. – Warszawa, 1982. – S. 156.
19. Дук Д.У. Полацкая кафля XIV – сярэдзіны XVI стст. – С. 167.
20. Из археологической коллекции псковского музея. – Фото 8:3.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова